4. Рубанов, В. От Петербурга до Претории / В. Рубанов. – СПб. : Типогр. журн. «Строитель», 1900. — 68 с.

5. Стахович, П. А. Очерки англо-бурской войны / П. А. Стахович.– СПб. : [б. и.], 1901. – 4 с.

Занько А. И., студент 214Т группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Котович О. В.,
кандидат культурологии, доцент

## ГІСТОРЫЯ ЎЗНІКНЕННЯ І СТАНАЎЛЕННЯ ФЕСТЫВАЛЮ-КІРМАШУ “ДАЖЫНКІ” Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Дажынкі – старадаўняе народнае свята беларусаў, звязанае з заканчэннем жніва. Дажынкавыя абрады былі скіраваны на тое, каб аддзякаваць “дужам нівы” за хлеб, захаваць яе плён на наступны год. Дажаўшы жыта, жнеі ўпрыгожвалі апошні сноп кветкамі і стужкамі, плялі вянкі з каласоў і кветак і з песнямі ішлі ў вёску. Зайшоўшы ў двор, яны перадавалі апошні сноп гаспадару, які запрашаў іх за гасцінны стол з абавязковымі абрадавымі стравамі. Усе абрады суправаждаліся дажынкавымі песнямі, іх спявалі па дарозе жнеі да хаты, у двары гаспадара і на святочным застоллі.. Абавязковым атрыбутам свята былі сноп жыта і сімвалічны каравай з толькі што сабранага збожжа [1, с. 344–345].

Узнікненне своеасаблівага новага святочнага формаўтварэння пад назвай Рэспубліканскі фестываль-кірмаш “Дажынкі” адбылося ў 1996 г. Ідэя зрабіць больш паважаным і шанаваным працу хлебароба належыць

Прэзідэнту А. Р. Лукашэнку. Прэзідэнт абавязкова прысутнічаў на кожным фестывалі і не толькі асабіста ўшаноўваў хлебаробаў, якія занялі першыя месцы ў спаборніцтве на палях краіны, але і аналізаваў зробленае, ставіў задачы на будучыню [3].

Вывучэнне фактычных звестак і матэрыялаў рэспубліканскіх і раённых СМІ паказала, што гісторыя гэтага фестываля можа быць прадстаўлена ў наступнай храналогіі:

1 этап: станаўленне традыцый фестывалю (1996-2000);

2 этап: правядзенне фестывалю на нацыянальным узроўні (2001-2013);

3 этап: правядзенне фестывалю на абласным і раённым узроўнях (2014-2023);

Першы этап: станаўленне традыцый фестывалю. Першыя “Дажынкі” адбыліся 7–8 жніўня 1996 г. у самым цэнтры г. Столін, на плошчы імя Леніна. Перад вітальнымі прамовамі ўпершыню быў прадстаўлены сцяг “Дажынак” – тры перавязаных стужкай коласа на зялёным фоне. На другі дзень свята “Дажынкі” плаўна ператварыўшыся з фестывалю ў кірмаш. Па ўсім горадзе разгарнулі гандлёвыя палаткі, а на плошчы Леніна нават з’явілася імправізаванае “сяло рамеснікаў”. Купіць можна было не толькі прадукты, але і прамысловыя тавары, мэблю, сувеніры – увогуле, усё, што вырабляе Столінскі раён. Фестываль быў завершаны канцэртам з удзелам беларускіх артыстаў, як вядомых, так і самадзейных. Напрыканцы горад быў расквецены феерверкам. Першыя рэспубліканскія “Дажынкі” закончыліся.

Эстафету першых рэспубліканскіх “Дажынак” прыняў у 1997 горад Масты Гродзенскай вобласці. Адкрыццё “Дажынак-1997” праходзіла на абноўленай плошчы ля раённага Дома культуры. Ушанаванне пераможцаў і вялікі канцэрт адбыліся на спецыяльна

падрыхтаванай пляцоўцы ў парку на беразе ракі Нёман. Гэтая канцэртная плошча са сцэнай і млыном ужо шмат гадоў служыць гараджанам для вялікіх святаў.

На фестываль-кірмаш, які разгарнуўся на ўсіх буйных вуліцах горада і ў мікрараёнах, сабраўся ўвесь гандаль вобласці і многія прадпрыемствы рэспублікі. Кожная пляцоўка, аформленая ў беларускім стылі, мела сваю асаблівасць. Прыгожае, незабыўнае адчуванне ад свята засталося на доўгія гады ва ўсіх мастаўчан, хто прымаў удзел фестывалі-кірмашы. У многіх месцах былі арганізаваны сцэнічныя пляцоўкі, на якіх выступалі прафесійныя і самадзейныя артысты. У цэнтры быў арганізаваны велізарны горад майстроў, дзе свае вырабы дэманстравалі лепшыя народныя майстры Рэспублікі. Але святкаваў фестываль-кірмаш не толькі райцэнтр. Сцэнічныя пляцоўкі, гандлёвыя рады былі ўсталяваныя ў васьмі буйных вёсках раёна, толькі ў меншым фармаце. Усяго на святкаванне “Дажынак” у г. Масты было каля пяці тысяч чалавек [4].

“Дажынкі –1998” пераехалі ў Мінскую вобласць, г. Нясвіж. Тады на Міншчыне ўзнагародзілі рознай вартасці прызамі і дыпломамі 450 чалавек.

Як сведчаць афіцыйныя крыніцы, ў 1999 годзе “Дажынкі” у г. шклоў не адбыліся праз рэкордна нізкі ўраджай (узровень 1965 – 1970 гадоў). Але праз год, у 2000 г. “Дажынкі” ў г. Шклоў (Магілёўская вобласць) ўсё ж такі адбыліся. Былі ўзнагароджаны 242 хлебароба, а таксама ўпершыню ўзнагароды атрымалі 28 чалавек за ўборку льну.

Другі этап: правядзенне фестывалю на нацыянальным узроўні. Больш за 4 кіламетраў гандлёвых шэрагаў прадставіў г. Мазыр Гомельскай вобласці для правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу “Дажынкі-2001”. У мерапрыемстве прыняло ўдзел каля 1000

артыстаў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці з усёй краіны. Асаблівая ўвага была зроблена на добраўпарадкаванні горада і раённых населеных пунктаў [2, с. 83].

“Дажынкі-2002” прымаў ўжо г. Полацк Віцебскай вобласці. Самі дажынкавыя мерапрыемствы ладзіліся на дзесяці гарадскіх пляцоўках, пры гэтым галоўную эстраду мусілі “пазычыць” сталічныя ўлады. На свяце выступілі не толькі беларускія выканаўцы, але і зоркі расійскай эстрады. Пачаліся “Дажынкі” 6 верасня, а на наступны дзень горад наведаў беларускі кіраўнік А.Г. Лукашэнка, які ўзяў удзел у ганараванні пераможцаў жніва.

“Дажынкі-2003” адбыліся з 3 па 4 кастрычніка ў г. Пружаны Брэсцкай вобласці. У выніку праведзеных работ горад змяніўся настолькі, што многія падумалі, што патрапілі ў Еўропу. У Пружанах былі пабудаваныя новыя аўтастанцыя і Палац культуры. На еўрапейскі манер перабудавана гарадская гасцініца, абноўлены рэстаран, універмаг, рынак, у многіх жылых дамах памянялі вокны, дабудавалі мансарды, пракладзены новыя камунікацыі, траціну вуліц заасфальтавана, а тратуары выкладзены пліткай.

Горад Ваўкавыск Гродзенскай вобласці прыняў эстафету фестывалю-кірмашу “Дажынкі-2004” 17-18 верасня. “Дажынкі-2005” праводзіліся ў Мінскай вобласці ў адным з самых старых і прыгожых гарадоў Беларусі – у г. Слуцк. “Дажынкі-2006” зноў пераязджаюць у Магілёўскую вобласць у г. Бабруйск.

У Гомельскай вобласці прайшлі “Дажынкі-2007”. Горад Рэчыца падрыхтавалі да свята, правялі капітальны рамонт жыллёвага сектару, збудавалі летні амфітэатр на беразе ракі Днепр, а чыгуначны вакзал, гатэль, школу-інтэрнат, бальніцу і раённую паліклініку рэканструявалі.

У 2008 годзе “Дажынкі” прымаў Віцебская вобласць, г. Орша. Як і ў мінулыя гады, фестываль атрымаўся вельмі яскравым, не саступіўшы па размаху, колькасці гандлёвых радоў і артыстаў-выканаўцаў мінулым гадам.

“Дажынкі-2009” адбыліся ў Брэсцкай вобласці ў г. Кобрын. Да штогадовага фестывалю працаўнікоў сельскай гаспадаркі былі пабудаваны аквапарк і лядовы палац, заасфальтавана 120 кіламетраў вуліц, адрамантаваны фасады і дахі дамоў.

На гэты раз шчаслівы квіток на правядзенні 14-х “Дажынак” выпаў аднаму са старэйшых гарадоў Беларусі –г. Ліда Гродзенскай вобласці (24-25 верасня 2010 г.), які сустракаў лепшых хлебаробаў краіны. На два дні Рэспубліканскі фестываль-кірмаш “Дажынкі-2010” сабраў у раённым цэнтры больш за 100 тысяч удзельнікаў і гасцей. Гарадзейшчына ўжо ў трэці раз прыняла ўдзельнікаў свята. У 1997 годзе фэст прымаў г. Масты, у 2003 – г. Ваўкавыск. “Дажынак-2010” сталі для Ліды найбуйнейшым масавым мерапрыемствам за ўсю гісторыю яе існавання [5].

Сталіца рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі “Дажынкі-2011” у г. Маладзечна ўражвае маштабамі і грандыёзнасцю архітэктурных праектаў. Гэта быў своеасаблівы юбілейны 15 фестываль –кірмаш.

“Дажынкі-2012” прайшлі ў другой дэкадзе верасня ў Магілёўскай вобласці ў г. Горкі. Горад цудоўна аднавілі, рэканструявалі многія будынкі, цэнтральную плошчу.

“Дажынкі-2013” прайшлі 27 і 28 верасня ў г. Жлобін Гомельскай вобласці. Менавіта да гэтай падзеі чыгуначнікі завяршылі электрыфікацыю на ўчастку г. Бабруйск – г. Жлобін. Першая электрычка прыйшла на станцыю ў дзень святкавання “Дажынак”. Потым прайшло

ганаровае ўручэнне першых прэмій пераможцам спаборніцтва па ўборцы ўраджаю-2013. Затым прадоўжылася канцэртная праграма беларускіх майстроў мастацтваў, артыстаў Гомельскай вобласці, а таксама замежных гасцей, відовішчнае лазернае шоу і канцэрт народнай артысткі Украіны [6].

Апошнія "Дажынкі" рэспубліканскага ўзроўню прымаў г. Гарадок Віцебскай вобласці у 2014 годзе. Рашэнне правесці менавіта ў Віцебскай вобласці фестываль-кірмаш было абумоўлена тым, што "каравай" гэтага года пацягнуў на адзін мільён трыста тысяч тон збожжа – самы лепшы паказчык за апошнія тры дзясяткі гадоў. Адзін з экіпажаў намалацілі больш за 3 тысячы збожжавых, Лепшы вадзіцель здзейсніў на ўборачнай больш за 400 рэйсаў. Аграномы, работнікі збожжавых комплексаў – усе запрошаныя на абласныя "Дажынкі" атрымалі ўзнагароды ад улады краіны. Са збожжа новага ўраджаю да свята спяклі 120-кілаграмовы пірог як напамін, што хлеб – усяму галава. Да "Дажынак" змяніўся і райцэнтр. У мястэчку былі рэканструяваныя многія аб’екты сацыяльнага і культурнага прызначэння: вакзалы, аздараўленчы цэнтр для гульнявых відаў спорту, гасцініца, абноўленыя жылыя дамы і вуліцы [7].

Трэці этап: правядзенне фестывалю-кірмашу на абласным і раённым узроўнях. Пачынаючы з 2015 года, Рэспубліканскае свята "Дажынкі" змянілі свой фармат: з дзяржаўнага ўзроўню на лакальны. Цяпер фестываль арганізуецца ў адным з раённых цэнтраў Беларусі кожнай вобласцю самастойна. Аднак, значнасць свята не стала меней. Маштабнае святкаванне "Дажынак", падчас якога праслаўляецца чалавек працы, сярод краін постсавецкага часу, характэрна толькі для Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам святкаванне ў гонар заканчэння жніва мае вельмі глыбокія векавыя карані і праслаўляе дзве найвялікшыя каштоўнасці –

чалавека-працаўніка і нацыянальную культуру. “Хлеб – усяму галава!”, “Хлеб на стале – дастатак у хаце!” – казалі нашы продкі. Гэтыя адвечныя ісціны, дарагія і сёння кожнаму беларусу.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Котович, О. В. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – 12-е изд. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 592 с.

2. Сівурава, Л. П. Школьнікі ў кальчугах і шлемах / Настаўніцкая газета. – 2005. – С.82-86.

3. Областные «Дожинки-2014» на Витебщине: Городок встретил гостей с размахом и со вкусом [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://haradok.info/rus/%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%BE%D1%81%D1%82%D0%B8/%D0%BE%D0%B1%D1%89%D0%B5%D1%81%D1%82%D0%B2%D0%BE/1356/

4. “Дажынки-1997”. Мосты [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://www.mosty-zara.by/ru/news/dazhynk-1997.-mosty.html.

5. Проводятся первые “Дожінкі” [Электронный ресурс]. – Режим доступа http:// http:// 90s.by/15654. html.

6. Дожинки-2013 пройдут 27 и 28 сентября в Жлобине [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://bobruisk.ru/news/2013/09/21/35140.

7. Областные «Дожинки-2014» на Витебщине: Городок встретил гостей с размахом и со вкусом [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://haradok.info/rus/%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%BE%D1%81%D1%81%D

1%82%D0%B8/%D0%BE%D0%B1%D1%89%D0%B5%D1%81%D1%82%D0%B2%D0%BE/1356/.

Запиляй А. А., студент 313К группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Кривошеева С. В.,
кандидат искусствоведения

## ТЕХНОЛОГИИ И СПОСОБЫ ДЕКОРИРОВАНИЯ КЕРАМИЧЕСКИХ ИЗДЕЛИЙ: ТРАДИЦИИ И НОВЫЕ ПОДХОДЫ

Керамика – это искусство, которое имеет богатую историю. Веками керамические изделия были украшены разнообразными способами: от простейших рисунков до сложных глазуровок и техник эмалирования [1, с. 16]. Использование визуальных элементов для украшения керамики имеет целью не только создание красивых предметов, но и передачу исторической и культурной ценности. В наше время разнообразие способов декорирования керамики значительно расширилось благодаря инновационным методам и новым техникам.

Для того чтобы придать керамическим изделиям завершенный вид и художественную ценность их украшают рельефом, глазурью или росписью. Декорирование осуществляется различными методами: скульптурными (создание рельефа); живописными (роспись керамическими красками, ангобами); технологическими, которые не только украшают изделие, но и улучшают его свойства [2, с. 8].

Одним из способов придать художественную завершенность глиняному изделию является ангоб. «Ангоб» в переводе с французского